# Права

*Ю.П. ДОЎНАР*

## ЗАРАДЖЭННЕ ІНСТЫТУТА ПРАФЕСІЙНАЙ АДВАКАТУРЫ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ

Рассматриваются причины возникновения института адвокатуры в Великом княжестве Литовском и этапы развития. Его появление связано прежде всего с активизацией социально-экономической жизни государства и реформированием всей системы общественных отношений, в том числе в области судоустройства и судопроизводства.

The article reveals the reasons of the origin of professional defenders in the Great Duchy of Lithuania and stages of their evolution. The author considers the activation of soco-econo-mic process, reforming of social relations to be the key factors in the process of the origin of professional defenders. First defenders worked in the system of central courts, then – in central and local courts.

Інстытут адвакатуры развіваўся не толькі як прыватнае рамяство, але і як дзяржаўная ўстанова з часоў імператарскага Рыма, калі адвакаты падзяляліся на штатных і няштатных. Значна пазней на пэўным гістарычным этапе адвакацкая дзейнасць пераўтвараецца ў свабодную прафесію ў тым сэнсе, што доступ да яе быў адкрыты ўсім жадаючым, статус яе рэгламентаваўся заканадаўствам, а пры выкананні абавязкаў адвакат меў магчымасць карыстацца свабодай слова. Акрамя таго, з цягам часу адвакатура паступова становіцца асобнай грамадскай суполкай, якая знаходзіцца пры судовых месцах (аднак не ў іх скпадзе) і мае права аўтаноміі па пытаннях унутранага жыцця І дысцыплінарную ўладу над сваімі членамі[1].

Інстытут адвакатуры на Беларусі зарадзіўся даволі даўно, значна раней, напрыкпад, чым у Расіі. Так, І.Я. Файніцкі пісаў: "В России до последнего времени [маецца на ўвазе да судовай рэформы 1864 г.] не существовало адвокатуры; представительство сторон допускалось весьма не охотно, не только в уголовном, но даже в гражданском процессе, и Петр І перенес к нам мысль германского законодательства, по которой во всяком присутственном месте младший член по должности защищает ответчика, а обвинение представляется начальству и суду..."[2]

Нягледзячы на тое, што дзейнасць адвакатаў ужо ў XVI ст. была характэрнай для тагачаснага судовага жыцця, узнікненне і развіццё гэтага інстытута на Беларусі да нашага часу з'яўляецца маладаследаваным пытаннем прававой гісторыі, якое вывучалася навукоўцамі звычайна толькі ў кантэксце Іншых праблем. Напрыкпад, Ф.В. Тараноўскі пры характарыстыцы магдэбургскага права ў гарадах Вялікага княства Літоўскага адзначаў, што адвакаты на той час не былі добра дасведчанымі юрыстамі, а толькі "начётчикамі", як Іх называлі ў польскай літаратуры[3]. Закраналі гэта пытанне ў сваіх працах знакамітыя даследчыкі дарэвалюцыйнага перыяду С.А. Бяршадскі, М.В. Доўнар-Запольскі, М.К. Любаўскі, І.А. Маліноўскі і інш[4]. Асобны навуковы артыкул прысвяціў аналізу пытання С. Барысёнак, які перш за ўсё звярнуў увагу не толькі на існаванне ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI ст.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

адвакатуры, якая дзейнічала ў гарадах на падставе магдэбургскага права, але і на паступовае складванне той адвакатуры, дзейнасць якой рэгламентавалася агульнадзяржаўным заканадаўствам[5]. Менавіта апошняя, месцам дзейнасці якой былі спачатку цэнтральныя суды дзяржавы – Гаспадарскі суд, а пазней Галоўны суд (Трыбунал) – і мясцовыя земскія суды, мела сваю спецыфіку, характэрныя рысы і этапы развіцця.

Прычыны яе ўзнікнення звязаны з актывізацыяй сацыяльна-эканамічнага жыцця Вялікага княства Літоўскага – дзяржавы, палітыка-эканамічным цэнтрам якой былі беларускія землі. У XVI ст. праходзіць паэтапны працэс рэфармавання ўсіх грамадскіх адносін, у тым ліку судовага ладу і судаводства, што і знайшло адлюстраванне ў Статутах 1529, 1566, 1588 гг. Гэты працэс меў вынікам узнікненне і развіццё інстытута прафесійнай адвакатуры.

На пачатку XVI ст. актывізацыя сацыяльна-эканамічных адносін у Вялікім княстве Літоўскім запатрабавала прыняцця агульных для ўсёй дзяржавы нарматыўных актаў, на што неаднойчы звяртала ўвагу не толькі шляхта, але і кіраўніцтва дзяржавы. Напрыклад, вялікі князь Аляксандр у пацвярджальнай грамаце Валынскай зямлі 1501 г. пісаў: "...коли права Статуты у в отчизне нашой уставим, тогды вси земли наши одного ся права держати мають и одным правом сужоны будуть подле Статуту"[6]. Менавіта ў статутавым заканадаўстве выразна адлюстравалася паэтапнае развіццё прафесійнай адвакатуры.

Зразумела, што і да ўвядзення ў дзеянне першага кадыфікаванага зводу законаў дзяржавы – Статута 1529 г. – мелі месца грамадскія адносіны, якія выклікалі патрэбу і давалі падставу для прадстаўніцтва і абароны чужых інтарэсаў у судзе. Аднак менавіта гэты звод законаў зрабіў значны прарыў у накірунку ўтварэння прафесійнай адвакатуры, хаця б таму, што высунуў на першае месца значэнне пісанага закону, а не звычая. З гэтага часу бакі, пачынаючы судовы працэс, мусілі клапаціцца пра тое, каб выканаць патрабаванні Статута, тым больш, што адначасова ўзнікалі і пытанні адносна тлумачэння новага закону: аб падсуднасці спраў, тэрмінах даўнасці, наступствах няяўкі на суд і інш. Спрыяльнае завяршэнне судовай справы цяпер стала ў значнай ступені залежаць не толькі ад наяўнасці доказаў, абавязак пошуку якіх ляжаў на баках, але і ад умення асвятлення іх з пункта гледжання закона. Як адзначаў С. Барысёнак, судовыя дакументы гэтага перыяду сведчылі аб заяўленні на судзе бакоў пра сваю гатоўнасць "отповедати", што азначала не толькі наяўнасць належных доказаў, але і веданне іх працэсуальна-прававога значэння, бо несвядомасць у праве магла пашкодзіць справе[7]. Між тым не заўсёды папярэдняя парада блізкіх родзічаў, "прыяцеляў", службоўцаў была здатнай, тым больш што не ўсе яны былі дастаткова кампетэнтнымі ў юрыспрудэнцыі. Акрамя таго, не кожны чалавек меў здольнасці выступаць на судзе. Кваліфікаванай юрыдычнай дапамогі патрабавалі таксама жанчыны, якіх раней прадстаўляў у судзе хтосьці з блізкіх людзей (бацька, муж і г. д.). Несумненна, што і паступовае ўскладненне судаводства абмяжоўвала магчымасць асабістага (або з дапамогай родзічаў ці прыяцеляў) правядзення судовага працэсу і павялічвала патрэбнасць у прафесійнай юрыдычнай дапамозе.

Пасля прыняцця Статута 1529 г. судаводства становіцца ўсё больш фармальным. Спрыяльнае завяршэнне справы пачало залежаць не толькі ад наяўнасці доказаў, што мелі на руках бакі, але і ад таго, ці цалкам яны адпавядалі патрабаванням закону. Суд пачынае ўсё большую ўвагу звяртаць на тое, ці адбываецца працэс "водлуг статуту прав земскіх", і бакі мусяць клапаціцца (і заяўляць аб гэтым у судзе пад пагрозай страты справы або і пакарання), каб усе патрабаванні закону былі выкананы. У судовых пастановах, як сведчыць, напрыклад, Літоўская Метрыка, усё часцей пасля ўвядзення ў дзеянне Статута 1529 г. пачынаюць сустракацца словы "водле обычая права и Статута земскаго", "яко в Статуте пишеть", "яко в Статуте



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

описуеть"[8]. У выпадку ж незразумеласці палажэнняў закону або неўрэгуляванасці адносін суддзі звяртаюцца да князя "за навукай" (асабліва па справах, якія тычыліся шляхецкага гонару[9]). Такім чынам, у першай палове XVI ст. у судовым працэсе ўсё больш праяўляецца тэндэнцыя неабходнасці ведання законаў, у сувязі з чым паступова пачынае фарміравацца група людзей, прафесіяй якіх становіцца іх тлумачэнне і дапамога прыватным асобам у практычнай рэалізацыі права, хаця ў гэты перыяд часцей за ўсё выступаюць у судзе родзічы або так званыя "служэбнікі" ад імя сваіх паноў. Тым не менш практыка ўдзелу адвакатаў у судовым працэсе пашыраецца. У сувязі з рызыкай праіграць справы (грамадзянскія і крымінальныя) розныя дзяржаўныя службоўцы (войты, бурмістры і г. д.), а часам і прыватныя асобы таксама пачынаюць праводзіць працэс праз "пракуратараў". Паступова ўсё больш шырокае кола насельніцтва разумее, што менавіта адвакаты, дапамагаючы бакам з'явіцца на суд у падрыхтаваным стане, садзейнічаюць спрыяльнаму завяршэнню справы.

Неабходнасць існавання прафесійнай адвакатуры ўзнікала і ў сувязі з тэндэнцыяй павелічэння фармалізаванасці грамадзянскага абароту і судовага працэсу. Ужо ў першай чвэрці XVI ст. амаль не існавала праваадносін, якім не надавалася б афіцыйная (дакументальна-лістовая) форма. У актавых кнігах сустракаюцца розныя судовыя дакументы ("лісты"): купчыя, дзельныя, заручныя, паручныя, менавыя, віноўныя, міравыя і інш[10]. Статут 1529 г. не толькі заканадаўча аформіў існуючую дакументальную фармалізаванасць, але ўнёс сваё дапаўненне (перш за ўсё ў сувязі з тым, што тагачасныя грашовыя праваадносіны патрабавалі большай пэўнасці), запісаўшы "абы жадин шляхцич и мешчанин не позычил вышей десяти коп без листу"[11].

Вучоныя адзначаюць, што са старажытных часоў напісанне пісьмовых дакументаў (скаргаў, хадайніцтваў, іскаў і інш.) засяроджвалася ў руках царкоўнікаў, а складанне тэстаментаў увогуле заўсёды было ў руках духавенства[12]. У першую чаргу розную юрыдычную дапамогу аказвалі людзям так званыя дзякі – пісьменныя людзі, сацыяльнае становішча якіх было розным. Іх спрадвечная дзейнасць прывяла да таго, што слова "дзяк" стала сінонімам слоў "пісар", "сакратар", "справавод". Буйныя феадалы ўвогуле мелі асабістых дзякоў, якія часам былі простымі людзьмі і называліся ўраднікамі, як і іншыя службовыя асобы. Шмат хто з іх пачаў прафесійна займацца адвакацкай дзейнасцю. Сярод адвакатаў былі і маладыя гаспадарскія дваране, што практычным шляхам папаўнялі веды ў галіне правазнаўства.

Спачатку новы інстытут дзейнічаў толькі адносна гаспадарскага (вялікакняжацкага) суда, куды галоўным чынам звярталіся радавітыя феадалы і справы якіх праводзілі гаспадарскія дваране, – магнацкая або шляхецкая моладзь ішла на "дворную службу" з мэтай прыдбаць пасаду, маёнтак або зарабіць грош. Яны былі ў асабістым распараджэнні гаспадара, паноў-рады і выконвалі іх разнастайныя даручэнні, у тым ліку судовага і выканаўчага характару, што і прывучала іх да юрыспрудэнцыі, знаёміла з матэрыяльным і працэсуальным правам. У судовых дакументах 30–40-х гг. XVI ст. усё часцей сустракаюцца прозвішчы адных і тых жа адвакатаў, якія выступаюць ад імя розных кліентаў. Напрыклад, шэраг спраў за 1540–1541 гг., у якіх удзельнічаў гаспадарскі дваранін п. Фларыян Жэбрыдоўскі, пераконвае ў тым, што перад намі сапраўдны адвакат[13].

Даволі часта адвакатамі ў гаспадарскім судзе выступалі пісары, якія доўгай практыкай складання юрыдычных дакументаў набылі не толькі значныя навыкі ў гэтай справе, але і юрыдычныя веды. Таксама сустракаюцца ў судовых дакументах прадстаўнікі гарадскога "вряда" (адміністрацыі) – войты, ландвойты, бурмістры, якіх службовыя абавязкі вымушалі да ведання закону. Разнастайнасць асоб, якія браліся за адвакацкую дзейнасць, тлумачыцца тым, што закон у гэты час амаль не закранае пытання аб статусе



This document has been edited with Infix PDF Editor
- free for non-commercial use.
To remove this notice, visit:
www.iceni.com/unlock.htm

пракуратараў у судовым працэсе. Статут 1529 г. толькі ў адным артыкуле гаворыць аб адвакатах і тое ў кантэксце агульнай тэндэнцыі палітычнай незалежнасці ад Польшчы, бо забараняе іншаземцам быць адвакатамі. Адзначым, што пасля ўвядзення ў дзеянне Статута 1529 г. пачынае яскрава вызначацца тэндэнцыя заняцця адвакацкай прафесіяй пэўнага кола асоб, і таму можна ўжо гаварыць аб зараджэнні інстытута прафесійнай адвакатуры ў дзяржаве. Хаця на гэтым этапе адвакаты яшчэ не былі звязаны агульнымі інтарэсамі і не ўяўлялі супольнасць, а праца іх часам спалучалася з разнастайнай дзяржаўнай ці грамадскай дзейнасцю.

Трэба звярнуць увагу і на тое, што паралельна з тэндэнцыяй фарміравання інстытута адвакатуры праяўляюцца і фактары стрымлівання яго развіцця. Так, тармазіў гэты працэс прынцып асабістай яўкі ў суд, тым больш што Статут 1529 г. не вызначыў адносін да гэтага пытання, хаця і гаварыў аб тым, што асоба, запрошаная на суд два разы "позвамі" (павесткамі), магла быць прымусова прыведзена на суд децкім, інакш суд меў права вырашыць справу без яе ўдзелу[14]. З аналізу статутавых артыкулаў бачна перавага прынцыпу асабістага ўдзелу ў судзе, а не судовага прадстаўніцтва. Вельмі часта ў судовых справах 30-х гг. XVI ст. сустракаюцца словы "старана... на тот рок не стала, никога теж на свое месцо не прысылала". У справах, змешчаных у 6-й кнізе судных спраў Літоўскай Метрыкі, слуханне справы ў асноўным вочнае і толькі ў некаторых справах замест бакоў (як правіла,ісцоў) выступаюць па іх даручэнню даверанья асобы[15].

Перш за ўсё адвакаты дзейнічаюць у вялікакняжацкім судзе. У мясцовых жа судах, у якіх судзіліся пераважна сярэднія і ніжэйшыя пласты насельніцтва (баяры, гаспадарскія дваране, мясцовае духавенства, розныя слугі і інш.) і дзе разглядаліся менш значныя справы (крадзяжы, абразы на грунце дробных сямейных сварак, бойкі, пабоі і г. д.), "пазываюць", "вінавацяць" і абараняюцца самі бакі. Пры гэтым яны настолькі былі вядомы суду, што не патрабавалася нават даверанасці. Калі ж звярталася ў мясцовыя суды "вяльможнае панства" (а яно было вельмі занята дзяржаўнай працай, палітычнымі і ўласнымі справамі і не мела часу на асабісты ўдзел у судовым працэсе), то іх прадстаўлялі "служэбнікі" або і спецыяльныя паверанья – пракуратары.

Дзейнасць адвакатаў, якая развівалася ў рэчышчы вольнага прыватнага рамяства і належным чынам не рэгламентавалася законам, мела шэраг недахопаў. Так, вельмі часта адвакаты забываліся пра сваю галоўную мэту – служэнне правасуддзю – і ўсялякімі сродкамі абаранялі толькі прыватныя інтарэсы, часам далёкія ад ісціны і справядлівасці. З гэтага вынікалі і карысныя памкненні адвакатаў, чаму садзейнічала няпэўнасць і заканадаўчая неўрэгуляванасць іх адносінаў з кліентамі.

Пытанне аб карысталюбстве адвакатаў і неабходнасці падпарадкавання іх дзейнасці служэнню грамадскім інтарэсам падымалася шляхтай неаднойчы. На Віленскім сойме 1547 г. шляхта ў кантэксце прапанаванай агульнай праграмы ўмацавання свайго сацыяльна-эканамічнага становішча ў дзяржаве запатрабавала ўтварэння адпавядаючай іх інтарэсам юстыцыі (больш таннай, выбарнай, аддзеленай ад адміністрацыі), а таксама ўдасканалення дзейнасці адвакатаў. Адзначалася, што адвакаты, "когды колвек речы судовые справують, непотребными и шырокими вымыслы своими его королевской милости и панам-радам их милости працы и трудности задають..."[16]. Была зроблена прапанова, каб "каждый свою реч сам справовал", а ў выпадку хваробы прасіў дапамогі ў прыяцеля. Трэба сказаць, што прыяцельскія адносіны ў той час былі спецыфікай не толькі прыватнага, але і грамадскага жыцця. У асяроддзі сяброў праходзіла ўсё жыццё шляхціца, а тым больш ён рабіў з іх дапамогай юрыдычныя дзеянні (напісанне тэстаментаў, развод і інш.)[16]. З сябрамі ён з'яўляўся і на суд, дзе яны ратавалі, выступалі адвакатамі, выкуплялі сваімі грашамі "от шии страченя"[17]. Нягледзячы на



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

тое, што пытанне на сойме не было вырашана, а адказ караля гучаў увогуле іранічна ("коли их сами наймовати не будете, тогды теж они, подобно, ни от кого ничого справовати не будуть"[18]), станоўчы момант шляхецкай прапановы быў несумненным. Яна звярнула ўвагу ўсяго грамадства на праблему адвакатуры і неабходнасць заканадаўчай рэгламентацыі яе дзейнасці.

Далейшае прававое жыццё дзяржавы паказала, што нельга было ні спыніць развіццё адвакатуры забаронай (як гэта прапаноўвала шляхта), ні прайсці міма праблемы (як гэта зрабіла кіраўніцтва дзяржавы). Досыць хутка дзейнасць адвакатаў набыла пэўную прававую рэгламентацыю. Статут 1566 г., які фактычна абагуліў 30-гадовую практыку адвакацкай дзейнасці, даволі ясна рэгламентаваў правядзенне справы на судзе як асабіста, так і праз пракуратара. Нягледзячы на тое, што бакі па-старому вымагалі асабістай яўкі супраціўнага боку, не задавальняючыся прысутнасцю прадстаніка, і суды па-рознаму адносна кожнага канкрэтнага выпадку разглядалі гэта пытанне, працэс заканадаўчага афармлення прафесійнай адвакатуры пачаўся. Статут 1566 г. узаконіў і адказнасць "фальшывых і падступных адвакатаў": шляхціцаў – пазбаўленнем гонару, простых людзей – смерцю ("горлам")[19]. Аднак закон яшчэ не патрабаваў, каб адносна цяжкіх злачынстваў (дзе справа ідзе "аб горле") абвінавачаны мог "адпавядаці праз пракуратара". Ён павінен быў асабіста з'явіцца на суд. Такую норму ўвёў толькі Статут 1588 г.[20] Ён канкрэтызаваў парадак прадстаўніцтва ў судзе, рэгламентаваў правы і абавязкі адвакатаў, удакладніў іх адказнасць і шмат іншае. Так, у Статуце 1588 г. гаварылася не толькі аб асобах, якія мелі права быць прафесійнымі адвакатамі, але і аб тых, хто не меў права займацца адвакацкай дзейнасцю. У першую чаргу гэта тычылася духоўных асоб і мясцовых суддзяў (суддзі, падсудка, пісара земскага суда, суддзяў гродскага суда і інш.). Аднак закон агаворваў, што гэта закранае толькі тыя паветы, дзе яны былі "врядниками". Адначасова прадугледжваліся і пэўныя выключэнні з адзначанага правіла (р. IV, арт. 58).

Асаблівую ўвагу Статут 1588 г. надаваў парадку афармлення прадстаўніцтва на судзе. Так, у выпадку няяўкі ў суд па прычыне хваробы (ці іншым уважлівым прычынам) ісцец ці адказчык, пасылаючы замест сябе адваката, павінен быў папярэдне належным чынам аформіць спецыяльны ліст. Зрабіць гэта трэба было ў канцылярыі якога-небудзь "вряда" (вялікакняжацкага, земскага, замкавага). Закон удакладняў, што па такіх даручэннях маглі быць адвакатамі і людзі "неаселыя" (гэта значыць не маючыя нерухомай маёмасці). Калі ж у выпадку цяжкай хваробы (або вялікай адлегласці да "вряда") ліст нельга было аформіць асабіста ў судзе, гэта можна было зрабіць завочна ўласна складзеным лістом, аднак яго павінны былі засведчыць пячаткамі і подпісамі паны радныя і адзін староннi чалавек. Хто не ўмеў пісаць – у тым жа лісце, або выпісцы "вряда" з назвай справы, прыкладваў уласную пячатку і сведчыў гэта подпісамі і пячаткамі яшчэ двух шляхціцаў. Аднак па такому "неврядовому" даручэнню адвакат павінен быў быць аселым, прычым удакладнялася – аселасцю шляхецкай. Гэтыя прадстаўнікі прымаліся кожным "врядом" і мелі поўную моц па судовай справе, у тым ліку адносна іскавых патрабаванняў, абвяржэнняў, тэрмінаў разгляду справы і інш. (р. IV, арт. 56).

Закон прадугледжваў і такі выпадак: хто не мог асабіста "мовіць" у судзе (не ўмеў гаварыць і самастойна весці сваю справу), па яго вуснаму даручэнню ў працэсе прымаўся нават неаселы прадстаўнік. Калі справа ішла аб смяротным пакаранні (або меўся асабісты запіс, якім ён абавязваўся не пакідаць судовы працэс), абвінавачаны не мог пакідаць залу суда да заканчэння справы (р. IV, арт. 57). Закон патрабаваў, каб удовам, сіратам і людзям "убогим и недостаточным" адвакат прызначаўся бясплатна (р. IV, арт. 57). Асобным артыкулам Статут прадугледжваў тыя дзеянні, якія не мог рабіць адвакат па справе без згоды свайго падапечнага. Так, ён не мог учы-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

няць ніякіх новых запісаў, рабіць прызнанні у судзе ці браць у каго-небудзь грошы (або разлічвацца) па зробленых падапечным запісах (р. IV, арт. 61).

Закон падрабязна рэгламентаваў уважлівыя прычыны няяўкі адваката ў суд, якія не шкодзілі яму і справе. Перш за ўсё гэта смерць, а таксама цяжкая хвароба, аднак апошняе – з пэўнымі агаворкамі. Так, калі адвакат не з'явіўся ў суд па прычыне "обложной" хваробы, ён павінен быў аб гэтым неадкладна паведаміць суддзі, а потым на наступнай судовай сесіі прынесці прысягу, што сапраўды "иж за хоробою на первшых рокох не становился" (р. IV, арт. 60).

Дастаткова поўна рэгламентуючы прававы статус адваката і абавязваючы яго добрасумленна ў межах закона і ў інтарэсах даверніка весці справу, Статут 1588 г. прадугледжваў і адказнасць адваката ў выпадку недобрасумленнага выканання абавязкаў. Закон рэгламентаваў наступныя склады злачынстваў адносна адвакацкай дзейнасці: а) няяўка на судовую сесію без уважлівых прычын; б) выданне інтарэсаў даверніка на карысць супраціўнага боку; в) падробка даверанага ліста з мэтай прычынення шкоды асобе, якая нібыта выдала гэты ліст (гэта значыць з'яўленне ў судовым працэсе ілжэадваката); г) наўмысны недагляд "ко шкоде" даверніка даручанай справы (р. IV, арт. 59). У выпадку неналежнага выканання сваіх абавязкаў адвакат падвяргаўся не толькі маёмаснаму штрафу, але і турэмнаму зняволенню, а ў асобных выпадках (здрада інтарэсам падапечнага) – нават смяротнай кары (р. IV, арт. 59). Давернік жа мог пажадаць самастойна весці справу і "отставити прокуратора своего" або даручыць яе вядзенне іншаму адвакату.

Такім чынам, мы бачым, што Статут 1588 г., які быў дзеючым законам амаль да сярэдзіны XIX ст., ужо даволі дакладна і падрабязна рэгламентаваў дзейнасць адвакатаў. Ён завяршыў заканадаўчае афармленне інстытута прафесійнай адвакатуры.

[1] Гл.: Фойницкий И.Я. Курс уголовного судопроизводства. СПб., 1912. Т. 1. С. 483.
[2] Тамсама. С. 482.
[3] Гл.: Тарановский Ф.В. Обзор памятников Магдебургского права западно-русских городов Литовской эпохи: Ист. юрид. исслед. Варшава, 1897. Кн. 7–9. С. 43.
[4] Гл.: Лаппо И.И. Земский суд в ВКЛ в конце XVI в. // Журнал Министерства народного просвещения. 1897. № 6; Леонтович Ф.И. Суд господарей и их советников в ВКЛ до и после Люблинской унии // Журнал Министерства юстиции. 1909. № 6; Ясинский М. Очерки по истории судоустройства в Литовско-Русском государстве. Главный Литовский Трибунал. Происхождение. Киев, 1901.
[5] Гл.: Борисенок С. Утворення професійноі адвокатури в Литовсько-руськiй державі // Працы комісіі для вывучэння историі заходне-русско-украинского права. Киев, 1927. С. 84.
[6] Ясинский М. Уставные земские грамоты Литовско-Русского государства. Киев, 1889. С. 73.
[7] Гл.: Борисенок С. Указ. тв. С. 109.
[8] Гл.: Литовская Метрика. (1528–1547). 6-я книга судных дел. Вильнюс, 1995. № 214, 161, 190, 174 і інш.
[9] Гл.: Тамсама. № 244, 194 і інш.
[10] Гл.: Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов. Т. XXXII. Акты Вилкомирского гродского суда. Вільна, 1907. С. XII.
[11] Статут Великого княжества Литовского 1529 года. Мн., 1960. Р. X, арт. 3.
[12] Гл.: Борисенок С. Указ. тв. С. 113.
[13] Гл.: Статут... Р. XVI, арт. 16.
[14] Гл.: Литовская Метрика. (1528–1547). 6-я книга судных дел. Вильнюс, 1995. № 262, 277, 382, 391 і інш.
[15] Борисенок С. Указ. тв. С. 84.
[16] Гл.: Любавский М.К. Областное деление и местное управление Литовско-русского государства ко времени издания первого литовского статута. М., 1892. С. 638.
[17] Демченко Г.В. Наказание по Литовскому Статуту в его трех редакциях (1529, 1566, 1588 гг.). Киев, 1894. Ч. 1. С. 47; Статут... 1529. Р. VII, арт. 30.
[18] Литовская Метрика. Отд. 1–2. Ч. 3. Т. 1. Юрьев. 1914. С. 159.
[19] Гл.: Статут Великага княжества Литовского 1566 года и поправы статутовые 1578 года // Временник Императорского Московского Общества истории и древностей Российских. Книга 25. Отд. II. № 1–242. М.,1855. Р. IV, арт. 35.
[20] Гл.: Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 года: Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мн., 1989. Р. IV, арт. 30.

Паступіў у рэдакцыю 05.09.2002.

***Юлія Пятроўна Доўнар*** – аспірантка кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы І права. Навуковы кіраўнік – доктар юрыдычных навук, прафесар Я.А. Юхо.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm